Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Азотныя ўгнаенні

## Унясенне азотных угнаенняў

Насычаючы глебу элементамі сінтэтычнага паходжання, неабходна строга выконваць інструкцыю. Яна дадаецца да любой сумесі з азотам.

***Агульныя правілы***

• Ключ да поспеху — захаванне патрэбнай дазіроўкі.

• Адно і тое ж угнаенне для розных культур выкарыстоўваецца па-рознаму. Для слівы 20 г будзе лімітнай дозай на 1 м$^2$ прыствольнага круга, а для яблыняў і груш 25 г — мінімальная «порцыя», аптымальна браць 30 г.

• Для прыгатавання воднага раствору бяруць менш гранул, чым пры «сухой падкормцы».

• Кіслыя ўгнаенні лёгка засвойваюцца, многія віды грунту са звычайным pH маюць у іх патрэбу. Але пры шматгадовым унясенні яны закісляюць глебу, таму ўжываюць іх з перапынкамі.

• Хімічна нейтральныя дабаўкі маюць фізіялагічны паказчык кіслотнасці — pH7. Ён не ўплывае на стан грунту — калі вы бачыце такую адзнаку на пачку, можаце выкарыстоўваць дабаўку штогод.

• Азотна-фосфарна-каліевыя сумесі для сілкавання агуркоў, якія ўзышлі, і памідораў, якія прыжыліся, у сярэдзіне лета варта дапаўняць арганікай. Напрыклад, гноем або перагноем.

• Пры падкорме бульбы гранулы змешваюць з грунтам.

• Градкі пад будучыя баклажаны і балгарскі перац угнойваюць комплекснымі сумесямі з паніжаным утрыманнем азоту восенню — на наступнае лета.

• Вінаград падкормліваюць ранняй вясной — прама па снезе.

• Для клубніц больш эфектыўна ўносіць грануляваны прадукт падчас рыхлення ўнутр глебы.

## Шкода азотных угнаенняў

Мы шмат гаворым пра карысць мінеральных соляў з азотам. Аднак трэба памятаць, што ва ўсім варта ведаць меру — празмернасць ні да чаго добрага не прывядзе.

Для чалавечага арганізма ўгнаенні з азотам бясшкодныя, калі іх правільна ўжываць. Так, напрыклад, усе віды нітратных сумесяў перастаюць выкарыстоўваць за 3-4 тыдні да збору ўраджаю. За гэты час утрыманне нітратаў нармалізуецца (калі вы рэгулярна не перавышалі дазіроўку на працягу вясны і лета).

Большую частку мінеральных соляў азоту ўносяць вясной ці ў першай палове лета, да восені іх канцэнтрацыя ў пладах у любым выпадку выраўнуецца. Таму іх празмернасць негатыўна адаб'ецца на раслінах, а не на людзях. Гэта можа выявіцца ў наступным.

✓ Таматы і агуркі накіруюць усе сілы на буйное развіццё зеляніны. Завязяў пры гэтым не з'явіцца ці плады будуць невялікія.

✓ Бульба дасць пышны бульбоўнік, вышыня якога перавысіць норму на 20—40 %. Пры гэтым сфарміруецца шмат дробных караняплодаў.

✓ Ягады і пладовыя кусты назапасяць занадта шмат вады ў парастках. Зімой, нават вельмі цёплай, яны стануць мерзнуць.

✓ Цыбуля, буракі і морква будуць дрэнна захоўвацца, хутка згніюць.

Пазбегнуць гэтага проста — прытрымлівацца правілаў выкарыстання сінтэтычных сумесяў.

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 11 красавіка)*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.01 | 20.18 | 14.17 |
| Віцебск — | 5.47 | 20.11 | 14.24 |
| Магілёў — | 5.51 | 20.08 | 14.17 |
| Гомель — | 5.51 | 20.01 | 14.10 |
| Гродна — | 6.17 | 20.32 | 14.15 |
| Брэст — | 6.21 | 20.29 | 14.08 |

### Месяц

***Першая квадра 15 красавіка.***
***Месяц у сузор'і Льва.***

### Імяніны

***Пр.*** *Фядоры, Марка, Мікалая, Палікарпа, Платона, Сямёна.*
***К.*** *Аліцыі, Апалонія, Багуслава.*

Фота Лізаветы ГОЛАД.

## ЗАЎТРА




## 18 КРАСАВІКА

### Даты

У краіне

**1814** год — нарадзіўся (г. Лагойск) Яўстафій Тышкевіч, беларускі археолаг, гісторык, этнограф, краязнавец, музеязнавец; адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай археалогіі. З літаратурных твораў Я. Тышкевіча захаваліся вершы, стылізаваныя пад фальклор, аповесць «Нашы краі» (1871), успаміны пра В. Ваньковіча, Я. Рустэма, І. Ходзьку і інш. У рукапісах засталіся яго працы «Зельнік барысаўскіх ваколіц», «Матэрыялы да нашай гісторыі», асобныя матэрыялы па археалогіі, збор дакументаў і інш.

**1903** год — нарадзіўся Платон Галавач, беларускі пісьменнік, празаік. У 1926-м скончыў Камуністычны ўніверсітэт Беларусі ў Мінску і стаў працаваць загадчыкам аддзела ЦК ЛКСМБ, з 1928-га быў першым сакратаром ЦК ЛКСМБ і рэдактарам газеты «Чырвоная змена». З лістапада 1929-га да сакавіка 1930 года — намеснік наркама асветы БССР. Адзін з кіраўнікоў літаратурных арганізацый «Маладняк», БелАПП. У розны час рэдагаваў часопісы «Маладняк», «Полымя». З пачатку сваёй літаратурнай дзейнасці (1921) змагаўся за чысціню роднай мовы, за яе дакладнасць і выразнасць. Выбіраўся членам ЦК КПБ і ЦВК БССР.

У свеце

**1518** год — міланская прынцэса Бона Сфорца выйшла замуж за Жыгімонта I і каранавалася як каралева Польшчы і вялікая княгіня літоўская. У шлюбе нарадзілася двое дзяцей — Жыгімонт Аўгуст і Ганна Ягелонка.

### Падзеі

**1563** год — Іван Фёдараў (кнігавыдавец, асветнік, заснавальнік кнігадрукавання ў Расіі і ва Украіне, некаторыя даследчыкі лічаць, што ён паходзіць з беларускага роду Рагозаў) і Пётр Мсціславец (адзін з першых беларускіх друкароў і гравёраў) пачалі друкаваць у Маскве першую рускую кнігу — «Апостал».

**1846** год — амерыканец Роял Эрл Хаус запатэнтаваў тэлеграфны апарат.

**1870** год — I Ватыканскі сабор прыняў дагмат пра бязгрэшнасць Папы Рымскага.

**1902** год — у Вялікабрытаніі ўпершыню ў сусветнай паліцэйскай практыцы выкарысталі дактыласкапію для выяўлення злачынца.

**1930** год — радыё «Бі-бі-сі» ў вячэрнім выпуску паведаміла, што «навін няма» (англ.: there is no news).

### Людзі

Так гаварыў...

**ВІЛЬЯМ ПЕН:**

*«Хітрасць у параўнанні з мудрасцю — тое ж самае, што малпа ў параўнанні з чалавекам».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Не бойцеся кіроўцаў, у якіх вісяць маленькія баксёрскія пальчаткі пад люстэркам.**

**Што яны зробяць вам сваімі маленькімі кулачкамі?**

— Давай супакоімся і пагаворым пра дабро. Згода?

— Згода. Дабром гэта не скончыцца.

**— Цікава, а кот баіцца пыласоса?**

**— Паняцця не маю, ён жа ў нас толькі з кастрычніка жыве...**

— О, у вас у кватэры падлогі з падагрэвам?!

— Не, гэта пажар у суседзяў знізу.

**Жонка — мужу:**

**— Дарагі, ты б хацеў, каб нас было трое?**

**— Вядома, мілая!**

**— Заўтра прыязджае мая мама.**

— Я гляджу, Вася, вочы ў цябе сонныя, і спіна ўся падрапаная... Напэўна, зноў усю ноч не спаў, спіну сабе драпаў?

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11.759. Індэкс 63850. Зак. № 897.

Нумар падпісаны ў 19.30 17 красавіка 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12